Беларусь.info

№5 10/03/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Рэйтынг Лукашэнкі ў інтэрактыўным апытанні ток-шоў "Выбар" завышаны ў два з паловай разы!** Гэтая передача Ягора Хрусталёва заўсёды ідзе ў запісы, і апошні запіс "Выбару" быў аж 4 сакавіка. Без адмысловай фантазіі кандыдату Лукашэнка намалявалі фантастычныя 78 адсоткаў падтрымкі. Аднак студэнты-сацыёлагі старэйшых курсаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта правялі сваё сацыялагічнае апытанне на вуліцах Мінска і абласных гарадоў Беларусі: зе дзеючага прэзідэнта гатовыя аддаць свой голас 32,3% выбарцаў, а за яго асноўнага суперніка Аляксандра Мілінкевіча - 39,8%!

**Сёньня раніцай былога дэпутата Вярхоўнага савету 12 скліканьня Сяргея Антончыка затрымала міліцыя.** Яго прывезьлі ў суд Маскоўскага раёну Менску, дзе прысудзілі 15 сутак. Такі прысуд вынесла судзьдзя Маскоўскага раённага суду Надзея Равуцкая. Сяргея Антончыка прызналі вінаватым у непадпарадкаваньні і супраціве міліцыі. "Пачалася зачыстка", — гэтак ён пракамэнтаваў свой арышт.

**З 10 сакавіка міліцыя пераведзеная на ўзмоцнены варыянт нясення службы.** Такі загад падпісаў міністар унутраных спраў генерал-лейтэнант У. Навумаў.

**У Гомелі на плошчу, дзе плянуецца сустрэча зь Мілінкевічам, грузавікамі звозяць сьнег.** Камунальнікі пачалі звозіць сьнег з двароў і вуліцаў на плошчу Паўстаньня. Якраз у гэты час у горадзе пачалі раздаваць запрашэньні на сустрэчу з кандыдатам на прэзыдэнта ад аб’яднаных дэмакратычных сілаў Аляксандрам Мілінкевічам, якая мае адбыцца 14 сакавіка менавіта на плошчы Паўстаньня.

**Парлямэнт Польшчы прыняў адмысловую заяву да беларускіх выбараў.** “Сэйм рашуча асуджае грубыя парушэньні беларускімі ўладамі правоў беларускага народу на свабоднае выказваньне ўласнай волі ў свабодных і справядлівых выбарах. З асаблівай занепакоенасьцю адзначаем выпадкі ўжываньня сілы, пазбаўленьня свабоды, перасьледу запалохваньня апазыцыйных кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта а таксама актывістаў дэмакратычнай апазыцыі і нацыянальных меншасьцяў, асабліва палякаў, якія жывуць у Беларусі”, — гаворыцца ва ўхвале.

# Цытаты

На глыбіні 842 м Лукашэнка даў інтэрвію дзяржаўным сродкам масавай інфармацыі. Сярод іншага ён сказаў: **"Даже если я сильно вам, людям, надоел, но народ все-таки думает, что у них сегодня есть шанс в руках, а эти синицы и журавли в небе — еще как сказать".**

# Факты

**Па апошнім апытанням фонда “Грамадская думка” 51% расіян усё роўна, каго аберуць прэзідэнтам Беларусі.**